4. Киселик, А. Самые большие фэнтези-циклы. Чей длиннее? [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://www.mirf.ru/book/samye-dlinnye-fentezi-cikly/. – Дата доступа : 10.10.2023.
5. Исследование: в 2022 году производство российских фильмов и сериалов увеличилось на 16 % по сравнению с 2021-м [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://overclockers.ru/world/show/123733/issledovanie-v-2022-godu-proizvodstvo-rossijskih-filmov-i-serialov-uvelichilos-na-16-po-sravneniju-s-2021-m. – Дата доступа : 09.10.2023.
6. Сколько сериалов было выпущено в США в 2022 и как это повлияет на индустрию? [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://news.fidller.com/2023/01/17/v-2022-godu-bylo-snyato-599-teleshou/. – Дата доступа : 09.10.2023.

## МАДЫФІКАЦЫЯ КАШТОЎНАСНАЙ СВЯДОМАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ ВА ЎМОВАХ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ

***А.І. Смолік***
*Мінск, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*

Маладое пакаленне ў інфармацыйным грамадстве з'яўляецца важнай рухаючай сілай, так як яно арыентавана на інавацыі, рашэнне актуальных праблем, кардынальныя пераўтварэнні соцыуму. Таму паспяховую рэалізацыю задач сістэмнай мадэрнізацыі ўсіх сфер жыццядзейнасці беларускага грамадства, дзяржаўныя і грамадскія інстытуцыі звязваюць з моладдзю.

Даследаванне стаўлення беларускай моладзі да эканамічных і сацыяльна-культурных пераўтварэнняў сведчыць аб іх пазітыўнай ацэнцы большасцю маладога пакалення. Калектывісцкая каштоўнасная арыентацыя моладзі з'яўляюцца ў цэлым устойлівымі. Маладыя людзі маюць моцнае пачуццё патрыятызму і калектывізму, паважаюць традыцыйныя каштоўнасці, імкнуцца ўдасканальвацца, валодаюць такімі якасцямі, як працавітасць, самаадданасць і сумленнасць. Адзначаючы агульную пазітыўную сітуацыю з каштоўнаснымі арыентацыямі беларускай моладзі, усё ж варта, адзначыць, што ў асобных маладых людзей яны звужаныя, утылітарныя, вульгарныя і нярэдка скажоныя. Пад уплывам інтэракцыі з моладдзю Захаду асобныя юнакі і дзяўчаты аддаюць прыярытэт асабістым інтарэсам і імкнуцца задавальняць пастаянна растучыя матэрыяльныя запыты і патрэбы. У выніку запазычання каштоўнасных сістэм і мадэляў паводзінаў заходняй моладзі ў першай чвэрці XXI ст. у маладзёжным асяроддзі інтэнсіфіцырваўся працэс субкультуралізацыі. Для задавальнення патрэбнасці ў забавах, самавыяўленні і пастаянным інфармацыйным узаемадзеянні маладыя людзі актыўна і мэтанакіравана інтэгруюцца ў субкультурныя фарміраванні, ствараюць субкультурныя аб'яднанні, якія адлюстроўваюць іх погляды на жыццё, каштоўнасці і адпаведныя нормы паводзін, сфарміраваныя на іх уласным жыццёвым вопыце [2]. Аналіз каштоўнасных арыентацый маладога пакалення сведчыць аб дынамічных працэсах фарміравання яго аксіялагічнага

свядомасці, абумоўленых спецыфікай сацыяльна-эканамічных, палітычных, сацыяльна-культурных пераўтварэнняў, якія адбываюцца ў Беларусі на дадзеным гістарычным этапе грамадскага развіцця. Узмацненне міжкультурнай камунікацыі, адкрытая сацыякультурная сусветная прастора спрыялі трансляцыі каштоўнасных арыентацый, ідэалаў і патэрнаў заходнееўрапейскай культуры ў свядомасць значнай часткі беларускай моладзі. Заходнія ідэолагі імкнуцца навязаць юнакам і дзяўчатам ідэі філасофіі лібертарыянства, сутнасць якой заключаецца ў прапагандзе «новай» арганізацыі грамадства, заснаванага на ідэалогіі спажывецтва, у якім абвяшчаецца ўлада алігархаў-адзіночак, суб'ектыўна аддзеленых ад дзяржавы, ад функцый справядлівага пераразмеркавання грамадскіх дабротаў, незалежных ў сваім бізнэсе, асабістым жыцці і палітыцы [5]. Ідэалагічнае і псіхалагічнае ўздзеянне на свядомасць маладых людзей вядзе да насаджэння ім чужой і разбуральнай для беларускага грамадства сістэмы ідэй і каштоўнасцяў, уключаючы культываванне амаральнасці, індывідуалізму, адмаўленне ідэалаў патрыятызму і каштоўнасцяў чалавечага жыцця і т. п. Пад уплывам моладзевых субкультур Заходняй Еўропы ў некаторай часткі беларускіх юнакоў і дзяўчат пачала фармавацца іншая структура культурных каштоўнасцяў, сімвалаў, узораў і кодаў, якія сталі асновай розных субкультур [4, с. 31]. У суб'ектаў гэтых моладзевых супольнасцяў пачаўся працэс раздвойвання вектара каштоўнасцяў: адна частка па-ранейшаму арыентуецца на традыцыйныя абсалютныя, трансцэндэнтныя сэнсы, а другая – на ўтылітарныя, адносныя, іманентныя. Структура каштоўнасцяў, на думку культуролага С.У. Масленчанкі, пастулова трансфармавалася ў плюральную, дыферэнцыраваную на мноства элементарных каштоўнасных пазіцый і ўзаемазалежных макрапазіцый (гуманізм, канфармізм, нонканфармізм, уладалюбства і інш. [3]. У іерархіі каштоўнасцяў калектывісцкія каштоўнасці пастулова пачалі саступаць месца асобасным і геданічным. Шырокае распаўсюджванне сярод моладзі атрымалі ліберальна-дэмакратычныя каштоўнасці. Мадыфікацыя каштоўнасцяў сучаснай беларускай моладзі, на думку культуролага А.В. Бугаенкі, наўпрост залежаць ад адказу грамадства на сацыяльныя выклікі. Да глабалізацыйных працэсаў на першых пазіцыях знаходзіліся такія каштоўнасці, як сяброўства, здароўе, зносіны, адукацыя, працоўная дзейнасць і кар'ера, самаактуалізацыя, сям'я, дасуг і інш. З інтэнсіфікацыяй глабальнай культуры ў моладзевай супольнасці актуалізаваліся тэндэнцыі, якія спрыяць паслабленню сямейных, сяброўскіх і іншых сацыяльных сувязяў, абясцэньванне ідэй стваральнай працы і ўзаемадапамогі, ўкараненне антысацыяльных стэрэатыпаў і распаўсюджванне амаральнага ладу жыцця.

Такім чынам, у працы з маладымі людзьмі, у тым ліку і са студэнцкай моладдзю, трэба ўважліва ставіцца да іх субкультурных аб'яднанняў і іншых згуртаванняў. Заходнія арганізатары каляровых рэвалюцый перакананы, што ў субкультурных фарміраваннях юнакі і дзяўчаты становяцца больш пакорлівымі і падатлівымі да ўздзеяння. Яны падпарадкоўваюцца агульным паводзінам, дзейнічаюць, зыходзячы з інстынкту сляпога пераймання [6]. Пры арганізацыі выхаваўчай і ідэалагічнай работы з студэнтамі, на наш

погляд, варта больш актыўна і мэтанакіравана ставіцца да трансляцыі традыцыйных каштоўнасцяў беларускага народа. Інфармацыйная прастора вышэйшай навучальнай установы павінна быць прадстаўлена не толькі забаўляльнымі і спартыўнымі праграмамі, сенсацыямі пра жыццё прадстаўнікоў маскульту заходняга свету, а дамінуючымі павінны быць тэмы патрыятызму, павагі да традыцый беларускага народа, духоўна-маральнай сферы. Адначасова ўдасканаленне дзейнасці з фарміраваннямі моладзі ва ўмовах глабалізацыі немагчыма без карэкціроўкі навучальных праграм, вучэбнай літаратуры, стварэння спецкурсаў, навуковых трэкаў, дыялагічных пляцовак, інавацыйных напрамкаў і тэхналогій арганізацыі моладзевага вольнага часу. Усё гэта будзе спрыяць далучэнню маладых людзей да народнай і элітарнай культуры, гістарычнай памяці, што дазволіць, на нашу думку, больш эфектыўна фарміраваць у маладога пакалення патрыятычную свядомасць і нацыянальную ідэнтычнасць.

*Спіс літаратуры*


1. Бугаенко, А. В. Концептуальные подходы к исследованию динамики ценностей белорусской молодежи / А. В. Бугаенко // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2021. – №3 (41). – С. 47-54.
2. Гутько, О. Л. Модели жизненной стратегии в молодежной субкультуре / О. Л. Гутько // Вести Института современных знаний. – 2014. – № 3. – С. 52-57.
3. Масленченко, С. В. Субкультура и коммуникация: монография / С. В. Масленченко. – Минск : Ин-т радиологии, 2003. – 90 с.
4. Смолик, А. И. Субкультурные молодежные формирования XXI века: учебное пособие / А. И. Смолик, Л. К. Кухто, О.Л. Гутько. – Минск : РИВШ, 2022. – 196 с.
5. Botler-Bowdon, T. 50 greatbooksonphilosopy / Per. fromEnglishK. Savelyera. – Moscow : Eksmo, 2019. – 432 p. (inRuss.).
6. Earls, M. Herd: bow to change mass behavior using the energy of genuine human nature / Per. from English. A.A. Kalinina. – Moscow : Eksmo, 2008. – 432 p. (in Russ.).


## ГЕНДЕРНЫЕ СТЕРЕОТИПЫ О МИГРАЦИОННЫХ ВОЗМОЖНОСТЯХ В СИСТЕМЕ ПОКАЗАТЕЛЕЙ СОЦИАЛЬНОГО САМОЧУВСТВИЯ МОЛОДЕЖИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ


***А.П. Соловей***

*Минск, Институт социологии Национальной академии наук Беларуси*


Одним из приоритетных направлений в развитии современной отечественной социологии является изучение на теоретическом и эмпирическом уровнях различных аспектов социального самочувствия молодежи как социального-демографической группы. В дискурсе социологии молодежи не существует единого общепринятого определения «молодежи», что детерминировано полипарадигмальностью социологической науки. Для изучения социального самочувствия молодежи необходимым является выработать рабочее определение «молодежи» исходя из изучаемого предметно-проблемного поля исследования. На наш взгляд, наиболее полным в